# Старшыня райвыканкама сустрэўся з бізнес-супольнасцю раёна



Для вывучэння праблем і ўмацавання зваротнай сувязі старшыня райвыканкама Дзяніс Колясень правёў сустрэчу з бізнес-супольнасцю раёна.





Сустрэча атрымалася канструктыўнай, блізкай да зацікаўленага дыялогу. Абмяркоўваліся пытанні дзелавога і інвестыцыйнага

клімату, стварэння ў раёне свабоднай эканамічнай зоны, падрыхтоўкі кадраў па запатрабаваных на рынку спецыяльнасцях, добраўпарадкавання горада і раёна.





Індывідуальныя прадпрымальнікі і прадстаўнікі камерцыйных прадпрыемстваў выказалі гатоўнасць браць удзел у праектах, якія зробяць нашу Стаўбцоўшчыну яшчэ больш прыгожай і камфортнай, а ў 2022 годзе – і сталіцай свята «Абласныя дажынкі».

*Больш падрабязна пра сустрэчу чытайце ў газеце «Прамень».*

**Фота Таццяны Пяткевіч**